ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO.06 (3366) ● ● ЧАЦВЕР, 13 ЛЮТАГА, 2014

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

Энтузіясты добрых спраў **Стар. 2**

З Пагарэльцаў — у тундру, на Ямал
Дырэктар Самбургскай школы-інтэрната Ганна Мураўёва родам з Нясвіжскага раёна **Стар.** 3



Муратбек чытае “Новую зямлю”
У музеі Якуба Коласа пабываў выкладчык і журналіст з Астаны **Стар.** 4

СУПОЛЬНАСЦЬ

Імгненні моцнага сяброўства

У апараце Упаўнаважанага прэзентавалася чарговая фотавыстава з серыі “Беларусь шматнацыянальная”

ІВАН ЖДАНОВІЧ

Аляксандр Сасновіч прэзентуе чарговую серыю фотаздымкаў

Рыгор Арэшка

Прыемна, калі ў рабоце дзяржструктур ёсць сістэмнасць. Паўтары гады таму ў тэксце пад загалоўкам “Фотаздымкі становяцца гісторыяй” (№27, 26 ліпеня) мы расказвалі, што ў памяшканні апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, па мінскай вуліцы Камуністычнай, разгорнута фотавыстава “Беларусь шматнацыянальная”. На ёй можна было пабачыць, якім насычаным жыццём жывуць армянская, руская, турэцкая, украінская і карэйская этнасуполкі Беларусі.

І добрая справа мае працяг. Днямі прэзентавалася новая фотавыстава, на яе запрасілі лідараў розных этнасуполак краіны. Прымаў удзел у прэзентацыі і Упаўнаважаны Леанід Гуляка. Супрацоўнік апарата Аляксандр Сасновіч нагадаў: актывісты падбіраюць лепшыя фотаздымкі з жыцця суполак. Іх апрацоўваюць, раздрукоўваюць, змяшчаюць у рамкі, ствараюць паўнацэнную выставу — усё за дзяржаўны кошт. І госці, наведвальнікі апарата Упаўнаважанага, у тым ліку і замежныя, маюць магчымасць пабачыць: у нас прадстаўнікі розных народаў пачуваюць сябе як дома.

“Можна з гордасцю казаць, што ў Беларусі ёсць і мэтанакіравана рэалізуецца сістэмная дзяржаўная палітыка ў сферы міжнацыянальных, міжканфесійных стасункаў, — лічыць кіраўнік грамадскага аб’яднання “Русь” Іван Корда. — На мой погляд, цяпер, калі тое тут, то там у розных краінах успыхваюць унутраныя канфлікты, у выніку якіх гінуць людзі, трэба шырэй прадстаўляць гэты станоўчы досвед у свеце”. Такое меркаванне лідар рускіх у краіне, якіх, паводле яго словаў, у Беларусі каля дзесяці працэнтаў, выказаў пад час прэзентацыі фотавыставы і сустрэчы лідараў этнасуполак з Упаўнаважаным Леанідам Гулякам. Сам Леанід Паўлавіч звярнуў увагу: сапраўды, супольныя намаганні як дзяржавы, так і актывістаў розных этнааб’яднанняў даюць станоўчы вынік, ствараюць у грамадстве атмасферу сяброўскасці, сардэчнасці, даверу паміж людзьмі розных веравызнанняў і нацыянальнасцяў. Пра тое сведчыць і выстава выданняў, у якіх асвятляецца беларускі досвед пабудовы “грамадства міру і згоды”.

Прадстаўляла чарговую серыю здымкаў на выставе “Беларусь шматнацыянальная” старшыня Міжнароднага грамадскага аб’яднання “Татара-башкірская культураная спадчына “Чышма” Эльвіра Ляўшэвіч. Расказала пра традыцыйнае свята “Сабантуй”, якое супляменнікі яе ладзяць шырокім колам у Мінску, іншыя цікавыя справы актывістаў, самадзейных артыстаў суполкі.

ГОД ГАСЦІННАСЦІ

Прыязджайце з песнямі!

Аліна Грышкевіч

Сёлета ў Беларусі пройдуць Дні культуры Туркменістана

Пра падрыхтоўку да іх ішла размова на сустрэчы пасла Беларусі ў Туркменістане Алега Табанюхава з міністрам культуры Туркменістана Гунчой Мамедавай. Мяркуецца, што пад час Дзён культуры пройдуць гала-канцэрт беларускіх і туркменскіх дзеячаў культуры і мастацтва, выстаўка музейных каштоўнасцяў мастацка-прыкладнога мастацтва Туркменістана. У планах і Дні кіно з дэманстрацыяй фільма, прысвечанага класіку туркменскай літаратуры Махтумкулі, круглы стол ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Гунча Мамедава высока ацаніла ўдзел прадстаўнікоў Беларусі ў тых імпрэзах, што праходзяць у Туркменістане. Яна запрасіла беларускі бок на культурныя мерапрыемствы, што запланаваны сёлета: фестываль тэатральнага мастацтва, фальклорны фестываль, канферэнцыя, прысвечаная Махтумкулі. У красавіку 2012 года ў Туркменістане былі арганізаваны Дні культуры Рэспублікі Беларусь. У святочных мерапрыемствах прынялі ўдзел народныя артысты Беларусі Ядзвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч, вакальная група “Чысты голас”, музычны ансамбль дзяржаўнай філармоніі “ Свята” .

ПРЫЦЯГНЕННЕ СЭРЦАЎ

Слова афіцэра, ці Як заслужыць каханне

Гісторыя пра тое, як лейтэнант Сяргей Яфімчык выконваў загад і знайшоў жонку-сібірачку, якая аказалася беларускай

Іван і Валянціна Ждановічы

Расказваючы пра кіраўнікоў замежных суполак беларусаў, мы звычайна не акцэнтуем увагу на іх асабістым жыцці. І дарма! Гэта ж цікавая тэма, асабліва напярэдадні міжнароднага дня закаханых. І ўвогуле: нішто чалавечае нашым сацыяльна актыўным суайчыннікам з замежжа не чужое. Вельмі парадаваліся мы за шчаслівы паварот лёсу кіраўніка цюменьскай суполкі “Аўтаномія Беларусь” Сяргея Яфімчыка, калі пачулі ад яго гісторыю кахання. Дарэчы, спадар Сяргей — чалавек салідны з выглядам, з добрым гумарам, пазітыўным светаўспрыманнем. Можа, такі таму, што пашанцавала яму з жонкай? Ці з генеральскім вагонам, дзеля якога Сяргей Аляксандравіч гатоў быў… Але — аб усім па парадку.

Як трапіў сын настаўніцы беларускай мовы, што ў 1982-м закончыў у Гомелі школу з залатым медалём, у Цюмень? Праз Ленінград, дакладней — Ленінградскае вышэйшае ваеннае вучылішча чыгуначных войскаў і ваенных зносінаў. “Пашанцавала: матэматыку здаў на 5 і як медаліст адразу стаў курсантам”, — згадвае зямляк. У 86-м размеркавалі ў Сібірскую ваенную акругу, там атрымаў прызначэнне ў камендатуру ваенных зносін чыгуначнага ўчастка і станцыі Цюмень. З 1 верасня стажыраваўся на пасадзе памочніка ваеннага каменданта. “Яшчэ раз пашанцавала, бо трапіў у калектыў з даўнімі баявымі традыцыямі, што ідуць з 1935 года, — прадаўжае маёр запасу. — Камендантам аказаўся зямляк з Мазыра Міхаіл Фёдаравіч Ефімовіч, родавыя карані яго з Валаўска. Ён, дарэчы, пазней некаторы час і ўзначальваў суполку беларусаў Цюмені. У 86-м у камендатуры служылі яшчэ Мікалай Чыкіда з Гомельшчыны, Андрэй Ярэма з Гродна. З маім прыходам камендатуру, дзе было восем афіцэраў, заканамерна “ахрысцілі” беларускай.

Сяргей Яфімчык, як і абяцаў, нёс каханую на руках. 1987 год

Лейтэнант Яфімчык, як кажуць, ірваўся ў бой, і на першым жа самастойным дзяжурстве яму яшчэ раз “пашанцавала”: паступіў загад прычапіць да састава пасажырскі вагон, у якім паедзе генерал, камандзір чыгуначнага корпуса. І былі там такія нюансы, што справа аказалася цяжкавырашальнай. Ды як там сцвярджаюць мудрыя: смелага куля баіцца, смелага штык не бярэ. ➔ **Стар. 2**

ПРЫЦЯГНЕННЕ СЭРЦАЎ

Слова афіцэра, ці Як заслужыць каханне

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

А Святлана, будучая жонка Сяргея, працавала ва ўпраўленні Цюменскага аддзялення Свярдлоўскай чыгункі пасажырскім аператарам: магла прычапіць той вагон, а магла і адчапіць... Гэта генералам здаецца, што яны ўсім кіруюць, а на самой-та справе мы ж ведаем, хто… Ведаў і малады афіцэр-беларус, а таму пайшоў прама на паклон да Святланы. "Папрасіў яе: дзяўчына, дапамажыце мне, калі ласка! — згадвае з добрай усмешкай Сяргей Аляксандравіч. — Прычапіце вагон! Калі не паедзе генерал, мне спагнанне будзе, а паедзе — я вас на руках занясу куды скажаце. (Ну дзівак: быццам не ведаў, які загад аддасць дзяўчына прыгожаму, халастому лейтэнату! — **Аўт.**) Дарэчы, Святлана ў той час выглядала як падлетак, маленькая. Я прыкінуў: рост пад 158, па вазе не больш за 40, памер адзення 42-44… Ну, думаю, дакладна панясу. Куды пажадае! Цэлы вечар і яшчэ паўночы бегаў, кантраляваў: то Святлану, то вагон... З'ехаў, дзякуй богу, генерал! А я закахаўся. Так і пачалі сустракацца. Святлана родам з мясцовага сяла Бутусава, закончыла Карасульскую школу, потым чыгуначнае вучылішча ў Ішыме. Хутка 30 гадоў, як працуе ў Цюменьскім аддзяленні, ужо на пасадзе вядучага інжынера".

І было вяселле! І ён сапраўды нёс каханую на руках: з машыны ў сельсавет, а потым у вясковы дом, дзе бацькі Святланы ладзілі вяселле. "Распісваліся мы ў красавіку 87-га ў Бутусаве, вясна была ранняя і дружная, — згадвае Яфімчык. — На роспіс ехалі на УАЗіку: я ў вясельным касцюме і гумовых ботах па калена. А гразь была непралазная! Вось я нявесту ў рукі — і на роспіс, потым назад. На вяселле прылятала з Гомеля мама з сястрой, і мне на ўсё жыццё запомніліся яе словы: "Колькі гадоў на свеце пражыла, сынок, а такой гразёты век не бачыла".

Неяк потым мама спытала ў яго: "Як так: столькі ў Беларусі дзяўчат, а ты сібірачку знайшоў?". Так і не даведалася, бо памерла ў 1989-м, яшчэ ў савецкі час, што не проста так прыцягнуліся іх сэрцы. Аказваецца, Святланін родны дзед па матчынай лініі — Сямён Захаравіч Свіналуп з Віцебскай губерні, і нявестка яе таксама беларуска. А не прынята ж было пра тое ў сям'і казаць, бо дзеда з сям'ёй у 20-х рэпрэсавалі, саслалі з Ленінграда ў Сібір... Як, дарэчы, і тысячы іншых нашых суайчыннікаў.

ІВАН ЖДАНОВІЧ

Цяпер Святлана і Сяргей Яфімчыкі разам — гэта дуэт "Каханне"

У 2012-м у красавіку Сяргей са Святланай адзначылі сярэбраны юбілей: 25 гадоў яны разам. І быў зноў сапраўдны загс, і зноў надзелі яны заручальныя сярэбраныя пярсцёнкі, і гучаў марш Мендэльсона. Падзея мела грамадскі рэзананс, нават віншаванне было юбілярам ад кіраўніка адміністрацыі горада Цюмені Аляксандра Моора з уручэннем памятнага падарунка. Больш таго: беларускую сям'ю Сяргея і Святланы Яфімчыкаў занеслі ў Ганаровую кнігу юбіляраў Цюмені. А потым быў і рэстаран, дзе пад вясёлыя спевы народнага ансамбля беларускай песні "Лянок" танцавала не толькі вяселле, але і ўсе наведвальнікі. Дарэчы, Сяргей і Святлана — актыўныя ўдзельнікі ансамбля. Хораша спяваюць яны і дуэтам, які назвалі "Каханне", у рэпертуары шмат беларускіх песень.

Вось так, дзякуючы генералу, які, пэўна, і не заўважыў, што "падарыў" маладому афіцэру каханую, стала магчымым іх шчасце. Зрэшты, важна яшчэ, што моцным аказалася слова афіцэра-беларуса Сяргея Яфімчыка. Як сказаў дзяўчыне: "Панясу" — так і зрабіў! Чым не прыклад для іншых, як трэба служыць Айчыне, выконваць загады ваеннага начальства любой цаной — і адначасова слухаць сваё сэрца, каб заслужыць сапраўднае каханне. "Мы са Святланай выгадавалі двое выдатных дзяцей: сына Дзмітрыя і дачку Дашу, — напісаў з Цюмені Сяргей Яфімчык. — Сын працуе, як і маці, на чыгунцы — кіроўцам, дачка — бухгалтарам у Ваенным інстытуце. Летась Даша выйшла замуж, зяць Аляксей. Так што працяг у гісторыі кахання ага-вязкова будзе: унукаў чакаем…"

ВЕСТКІ

Аб пражытым і перажытым

Былы бібліятэкар Лідзія Валковіч піша мемуары і дакументальныя аповесці

Спачатку яна была проста школьным бібліятэкарам, потым стала маці пісьменніка, а цяпер і сама — пісьменніца. А родам Лідзія Іларыёнаўна, цяпер брастаўчанка, з роднай і мне вёскі Асмолавічы, што ў Клімавіцкім раёне. Раней яна, жонка кадравага ваеннага-франтавіка, жыла ў розных ваенных гарадках, займалася бібліятэчнай справай, сям'ёй. З мужам, Міхаілам Ільічом, выхавалі чатырох сыноў, двое з якіх сталі ваеннымі, адзін — пісьменнікам.

З сына, пэўна, і бярэ цяпер прыклад маці. Дарэчы, Аляксандр Валковіч, па адукацыі журналіст, выдаў пяць розных кніжак, сярод іх "Алеся. Белавежскія сны" і "Лета чырвоных коней", ён член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Дарэчы, Аляксандр яшчэ рэдагуе штоквартальны альманах "Астрамечаўскі рукапіс". Вось і маці ў 85 гадоў адчула смак у пісьменніцкай працы. Ужо ёсць у рукапісе кніга мемуараў пад назвай "Аб пражытым і перажытым". У дакументальнай аповесці яна згадвае даваеннае сваё жыццё, акупацыю Беларусі фашыстамі і тое, як яны вывозілі нашых землякоў на прымусовыя работы ў Германію. Дарэчы, пад час вайны Лідзія Іларыёнаўна ўратавала жыццё ўцекачу з фашысцкага палону.

Іван Лапо, г. Клімавічы

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

Энтузіясты добрых спраў

У сваім віншаванні старшыня Саюза беларусаў Латвіі Валянціна Піскунова палічыла важным аддаць даніну павагі і суполкам з розных рэгіёнаў краіны, і асобным іх актывістам

Валянціна Піскунова

У рэдакцыю з Рыгі дасланы электронны варыянт апошняга нумара газеты Саюза беларусаў Латвіі "Прамень", якая выдаецца ўжо 20-ы год. Шэраг тэкстаў прысвечаны Калядна-навагоднім святам, віншаванням ад розных арганізацый і ўстаноў. Падаецца рэпартаж з мноствам здымкаў і пра ўрачыстасці з нагоды 20-годдзя беларускага таварыства "Прамень" з Рыгі і 25-годдзя зараджэння там жа гурта беларускай народнай песні "Надзея". Пра тое, як адзначаліся юбілеі, мы яшчэ раскажам. А цяпер звернем увагу, як адметна павіншавала праз газету сяброў, аднадумцаў у беларускіх справах старшыня Саюза беларусаў Латвіі Валянціна Піскунова. Магчыма, гэты досвед спатрэбіцца і актывістам беларускага руху з іншых краін. Падаючы тэкст, з невялікімі скарачэннямі, і мы ўшаноўваем старанных, заносім на своеасаблівую "дошку гонару" суайчыннікаў, якія жывуць у Латвіі ў плыні беларускай культуры.

"Паважаныя беларусы Латвіі! Шчыра віншую Вас з Новым 2014 годам і Калядамі! Асабіста выказваю падзяку і сардэчна віншую: сталічную беларускую суполку "Прамень", яе кіраўніка Алёну Лазараву, цудоўны ансамбль "Надзея", салістаў і ўсіх членаў таварыства, якія робяць важкі ўклад у развіццё беларускай культуры ў Латвіі; суполку "Уздым", яе кіраўніка Валерыя Амбросава, паэта Станіслава Валодзьку, ансамблі, актыў, якія робяць добрыя справы ў галіне культуры, асветніцтва і мастацтва ў Даўгаўпілсе; суполку "Мара" ў Курземскім краі, яе кіраўнікоў Любоў Дурневу, Жанну Буйніцкую, удзельнікаў ансамбля, актывістаў за нястомную дзейнасць, а тое выяўляецца ў арганізацыі цікавых мерапрыемстваў, вечароў музыкі, тэатральных прадстаўленняў, якія маюць шырокі розгалас сярод жыхароў Ліепаі; суполку "Спадчына" з Вентспілса, якую ў першыя дні стварэння ўзначаліў знакаміты беларус, выпускнік маскоўскага Баўманскага вучылішча Мікалай Жаўрыд і вывеў на шырокі прастор грамадскай дзейнасці, і цяпер закладзеныя ім традыцыі прадаўжаюць Наталля Бальшакова, Алёна Нарушэвіч, Данута Багушка, Анжэла Зрайчанка ды іншыя; суполку "Вясёлка" з Краславы, яе кіраўніка Святлану Стальмачонак, намесніка Аляксандра Клімава, мастацкага кіраўніка ансабля "Куток" Яўгена Ільінца, усіх актывістаў гэтага аб'яднання дзякую за дабрыню Вашых сэрцаў, за адказныя адносіны да развіцця беларускага мастацтва і культуры ў гэтым рэгіёне Латвіі; суполку "Спатканне" і ансамбль "Завіруха" з Екабпілса, іх важакоў Валянціну Дарашчонак і Тамару Бухціяраву за актыўную працу па аб'яднанні беларусаў, пашырэнні культурнай спадчыны беларускага народа у Земгальскім краі і Латгаліі; суполку "Радуга" з горада Прэйлі, кіраўнікоў Валянціну Максімаву і Святлану Сцяпанаву, ансамблі "Рабінушка" і "Калінушка" за прыгожае і шырокавядомае аб'яднанне Прэйльскага краю і добрыя дзявочыя ансамблі, якія проста само харастваство і заглядзенне; суполку "Вербіца" і яе кіраўніка Таццяну Гагалінскую з падзеяй у жыцці беларускага аб'яднання — адкрыццём Цэнтра беларускай культуры Дагдскага краю, што станоўча паўплывае на дзейнасці суполкі "Вербіца", паспрыяе пашырэнню беларускай мовы, традыцый, беларускай спадчыны ў Дагдскім краі; суполку беларусаў з Рэзекне "Сузор'е", яе кіраўніка Людмілу Стэц, ансамбль за развіццё беларускай культуры, умацаванне сувязяў Латвіі і Беларусі, працу з моладдзю; суполку "Крыніца" Лудзенскага краю і таленавітага арганізатара Ігара Ермакова за актыўны ўдзел у развіцці беларускага руху ў Латвіі; суполку "Пралеска" горада Зілупэ і яе кіраўніка Наталлю Мірцхулава за паразуменне, падтрымку, умацаванне сяброўства народаў Латвіі; суполку "Сябры" і яе кіраўніка Віктара Гардзейку за прапаганду беларускай культуры ў Вілянскім краі; суполку "Злата" з Елгавы і яе старшыню Зенту Трэцьяк, якая заявіла пра сабе як добры арганізатар беларусаў, пашыральнік беларускай мовы, традыцый, культуры ў Елгаве і Елгаўскім рэгіёне; суполку з Елгавы "Лянок" і яе кіраўніка Алёну Грыслэ за актыўную прапаганду традыцый беларускага народа ў Елгаве.

Алёна Лазарава — дэпутат Сейма, кіраўніца суполкі "Прамень" — спявае разам з дочкамі

Усе названыя суполкі складаюць наш адзіны і непарушны Саюз беларусаў Латвіі, які ў Новым годзе, спадзяюся, заззяе новымі гранямі сваёй творчай дзейнасці.

Саюз беларусаў Латвіі атрымаў віншаванні ад Міністра культуры Беларусі Барыса Святлова, ад Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леаніда Гулякі з 2014 годам і Калядамі. Перадаю вам іх пажаданне ўсім беларусам Латвіі здароўя, дабрабыту, плённай працы па пашырэнні беларускай культуры ў Латвіі. Поспехаў вам, сябры!"

ЛЁСЫ

З Пагарэльцаў — у тундру, на Ямал

Дырэктар Самбургскай школы-інтэрната Ганна Мураўёва родам з Нясвіжскага раёна

Туды, дзе цяжэй…

З зямлячкай мы сустрэліся далёка ад Бацькаўшчыны, на знакамітым радовішчамі прыроднага газу паўвостраве Ямал, дакладней — у паселішчы Самбург Ямала-Ненецкай аўтаномнай акругі Цюменьскай вобласці Расіі. Ганна Мураўёва, у дзявоцтве Корсак, расказала, што нарадзілася яна летам 1960-га ў вёсцы Пагарэльцы Нясвіжскага раёна Міншчыны. Ёсць, дарэчы, і такі прыпынак у электрычак, што ідуць з Мінска да Баранавічаў — гэты горад таксама для яе родны. Мама працавала на чыгунцы манцёрам: падрамантуюць участак і пераязджаюць на новае месца. Дзяцінства Ганны прайшло, можна сказаць, на колах. Вучыцца пачала ў школе-інтэрнаце, а як атрымалі кватэру ў Баранавічах ды мама хацела перавесці яе ў школу звычайную, то таленавітую дзяўчынку адміністрацыя проста “не аддала”. Яе пазней абіралі старшынёй савета піянерскай дружыны, сакратаром камсамольскай арганізацыі. Да таго ж Ганна займалася ў гуртках, удзельнічала ў мастацкай самадзейнасці, з Клубам інтэрнацыянальнай дружбы ездзіла па Савецкім Саюзе, прадстаўляючы на фестывалях Беларусь.

Пасля школы Ганна закончыла ў 1981-м хімфак Ленінградскага педінстытута імя Герцэна. Маючы высокія балы, магла і ў Піцеры застацца, але, прызнаецца, душа ірвалася туды, дзе цяжэй. Інстытут меў дамову з Цюменьскай вобласцю, паводле якой штогод дзесяць выпускнікоў накіроўваў на Ямал: Поўначы патрэбны былі кваліфікаваныя кадры. Паглядзела, згадвае, атлас: Крайняя Поўнач, менш аднаго чалавека на квадратны кіламетр, снежнае покрыва дзевяць месяцаў у годзе… І вырашыла: паеду. На развітанне сяброўкі падарылі ёй фігурку ненца-лыжніка ў нацыянальным касцюме і праспявалі папулярную на той час песню “Увезу тебя я в тундру”… Прыехала ў Салехард, сталіцу Ямала-Ненецкай аўтаномнай акругі. Яе ўгаворвалі там і застацца, а ёй хацелася “яшчэ глыбей”. Прапанавалі Самбург, невялікае тундравае сяло пасярод балот. Улетку шлях туды па рацэ Пур, зімой — па зімніку, і рэйсавыя верталёты лятаюць, калі пашанцуе з надвор’ем. У школе займаюцца дзеці ненцаў-аленяводаў і рыбакоў, якіх прывозяць з тундры.

Ад радасці да поспеху

Дабіралася Ганна ў Самбург на кацеры, а сышла на бераг — так і замерла. Мясцовасць зусім іншая, чым у Беларусі ці ленінградскіх наваколлях. Але чалавек хутка да ўсяго прывыкае… І неўзабаве яна палюбіла някідкую прыгажосць тундры з яе нізкімі дрэўцамі, чароўнымі заходамі сонца. Два месяцы жыла ў будынку школьнага інтэрната разам з вучнямі: успамінала сваё інтэрнацкае дзяцінства. Сталовай у вёсцы не было, таму маладая настаўніца з дапамогай кіпяцільніка варыла яйкі ў алавянай кружцы, з яе ж піла чай ці каву. Потым Ганну падсялілі да жанчыны-заатэхніка: два ложкі з панцырнымі сеткамі ў пакойчыку, стол — вось і ўся мэбля. І яшчэ дзвюх дзяўчат падсялілі… “Нічога, затое весела і цікава было… — успамінае Ганна Мечыславаўна. — Цяжкасці тады нас не палохалі, мы імкнуліся пераадольваць іх годна”.

Вучні Самбургскай школы-інтэрната

У такіх чумах у тундры жывуць і цяпер

А ў хуткім часе яна выйшла замуж і стала Мураўёвай. Будучы муж працаваў у саўгасе энергетыкам, яго ведалі як майстра на ўсе рукі, і калі напярэдадні Новага года зламаўся школьны магнітафон, Ганна звярнулася да яго па дапамогу. Так і пазнаёміліся. Аказалася: ён родам з-пад Ленінграда! Яе мама доўга не верыла, што сустрэліся яны толькі на Поўначы, казала: гэта ты да яго паехала. А іх проста звёў лёс.

Яны далей разам уладкоўвалі побыт, адкрывалі ў Самбурзе тэлебачанне: першы перадатчык сабраў Юры, а Ганна вяла тэлепраграмы. З камерай абышлі ўсе наваколлі, здымалі дамашнія відэафільмы. Пазней два іх сыны і дачка таксама ўключыліся ў грамадскае жыццё: выпускалі насценгазеты, фатаграфавалі, пісалі сцэнары ўжо для школьнай тэлестудыі. А ў адпачынак усе абавязкова ехалі ў Беларусь. Так і жылі: насычана, шчаслива і вельмі цікава. А ў 1994-м сям’я перажыла вялікае гора: Юры не стала...

Да таго часу Ганна Мураўёва была завучам школы-інтэрната, а праз два гады яе прызначылі дырэктарам. Так і кіруе школай з таго часу. Яна ганаровы работнік агульнай адукацыі Расіі, у 2012-м ушанавана медалём ордэна “За заслугі перад Айчынай” II ступені, мае званні “Ветэран працы” і “Ветэран Ямала-Ненецкай аўтаномнай акругі”. Калектыў школы пад яе кіраўніцтвам працуе творча, скіраваны на інавацыі. Самбургская школа-інтэрнат уключана ў Федэральны Рэестр “Усерасійская Кніга Пашаны”, у Нацыянальны Рэестр “Вядучыя адукацыйныя ўстановы Расіі — 2009” і Усерасійскую Энцыклапедыю “Адораныя дзеці — будучыня Расіі”. Так што “школа Мураўёвай” добра вядомая ў сістэме адукацыі Ямала і не толькі. Яе навучэнцы станавіліся пераможцамі міжнародных фестываляў, шэрагу конкурсаў і спартыўных чэмпіянатаў. Настаўнікі рыхтуюць дзяцей да жыцця ў экстрэмальных умовах Поўначы, дапамагаюць асвоіць прафесіі аленявода, рыбака, паляўнічага, лесніка, чумаработніцы (ёсць і такая!) ці швачкі. У майстэрнях вучаць рабіць нарты для аленевай запрэжкі, начынне для чума, вучні займаюцца разьбой па дрэве і выпальваннем. Дзяўчынкі шыюць нацыянальную вопратку, робяць сувеніры з футра, пацерак і блакітнай самбургскай гліны.

Ганна Мураўёва

Бацькоўскі дом

Па гэты час Ганна памятае словы прывітання, якімі, як вядучая, адкрывала праграмы канцэртных выступленняў баранавіцкага Клуба інтэрнацыянальнай дружбы: “Ад сцен гераічнай Брэсцкай крэпасці і ад краіны зялёных дуброў і блакітных азёраў мы прывезлі вам шчырае сардэчнае прывітанне”. Беларускую мову Ганна Мечыславаўна не забывае: калі летась у Самбурзе быў фестываль дружбы піянераў і школьнікаў, то яна чытала на ім вершы Якуба Коласа ў арыгінале.

З падзякай успамінае зямлячка школу, дзе гартаваўся характар, акрэсліваўся лад яе жыцця. Успамінае настаўнікаў: дырэктара Баранавіцкай школы-інтэрната Уладзіміра Васільевіча Усцінава, настаўніка хіміі Уладзіміра Міхайлавіча Шабана, дзякуючы якому і сама стала настаўніцай хіміі — на яго хацела раўняцца. Памятае выхавальніцу Галіну Сямёнаўну Марулевіч, першую настаўніцу Веру Іванаўну Коўтун. Некаторых няма ўжо з намі, але памяць добрая пра іх застаецца. Бо так склалася, што сама Мураўёва больш за 30 гадоў працуе ў падобнай навучальнай установе, не забываючы “беларускія ўрокі чалавечай мудрасці”, якія сама калісьці засвоіла.

У Баранавічы сям’я Мураўёвых з Ямала прыязджала ў адпачынак. І ўсіх траіх сваіх дзяцей Юра і Ганна хрысцілі там у праваслаўным храме. Дарэчы, хоць сваякі мужа і жылі на Украіне і ў Ленінградскай вобласці, Беларусь яму вельмі падабалася. “У Беларусі, на мой погляд, ёсць свой адметны лад жыцця і свой парадак, і ёсць кіраўнік, які выразна ведае, якім павінен быць гэты парадак, пачынаючы з дарог, чыгуначных станцый, крам і вытворчасці, — дзялілася меркаваннямі спадарыня Ганна. — Там маральнае, эканамічнае развіццё ідзе без аглядкі на Заходнюю Еўропу, што заслугоўвае павагі. І жывем мы ў адной Саюзнай дзяржаве. З Баранавічамі, з Беларуссю звязана ўсё самае дарагое майму сэрцу. Там — наш бацькоўскі дом, куды езджу я, мая сястра і нашы дзеці. А цяпер Баранавічы — гэта і месца, дзе жыве памяць пра блізкіх мне людзей: там побач з мамай я пахавала і мужа. І ў гэты горад мне заўсёды хочацца вярнуцца”.

Людміла Бакланава,
г. Цюмень

ВЕСТКІ

Пад знакамі агню і таленту

Іван Іванаў

На выставе “Арт-вучпрацэс” у мінскай мастацкай галерэі “Універсітэт культуры” творы мастака-кераміста з Бабруйска Валерыя Калтыгіна суседнічаюць з творамі яго вучняў

У культурнай прасторы Беларусі, ды і за яе межамі добра вядомы міжнародныя пленэры па керамі цы “Арт-Жыжаль”. Адзін з галоўных “рухавікоў” іх — Валерый Калтыгін, старшыня Бабруйскага аддзялення Беларускага саюза мастакоў, лаўрэат спецпрэміі Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва. Цікавасць да гэтага ўнікальнага праекта пашыраецца, і выстава знаёміць тых, хто выбірае свой шлях у мастацтве, мастакоў-выкладчыкаў, кіраўнікоў студый выяўленчага мастацтва з цікавым досведам бабруйскай дзіцячай школы мастацтваў імя У.А. Дамарада. Прадстаўлены работы як настаўніка, Валерыя Калтыгіна, так і яго вучняў. У многіх творах ёсць месца сатворчасці: вопыт майстра і свежы погляд на свет юных керамістаў увасабляюцца ў эксклюзіўны твор. І гэта заўсёды творчы эксперымент.

Цікава, што ў экспазіцыі прадстаўлены творы, выкананыя на занятках у адпаведнасці з канкрэтнымі тэмамі і заданнямі. А побач — творы ў падобнай плыні самога майстра. Ён любіць імправізаваць, ягоная кераміка — гэта экспрэсіі, гратэск, трансфармацыі, дэфармацыі формаў, якія да таго ж маюць фактурны дэкор, ляпныя часткі і дэталі.

Як вядома, асоба мастака, яго пазіцыя ў мастацтве — гэта заўсёды яскравы прыклад для вучняў. І Валерый Калтыгін, выкладаючы азы “керамічных” ведаў, вядзе адметную творчую лінію. Ён распрацаваў методыку выкладання свайго штукарства пачаткоўцам, вучням рознага ўзросту і развіцця ды паслядоўна яе ўдасканальвае.

Дзве мовы для метро

Назвы станцый у мінскім метро з 20 красавіка будуць аб’яўляць на беларускай і англійскай мовах

Начальнік Мінскага метрапалітэна Расціслаў Юрэня паведаміў: у сувязі з правядзеннем у беларускай сталіцы чэмпіянату свету па хакеі ў працы метрапалітэна плануюцца і іншыя новаўвядзенні. “Увесь блок моўных аб’яваў у вагонах і на станцыях будзе дубляваца на англійскай мове, у тым ліку назвы станцый. Запіс праведзены — засталося яго загрузіць у інфарматары. Гэтая сістэма будзе запушчана з 20 красавіка”, — адзначыў Расціслаў Юрэня.

Кантралёрам і касірам выдалі ўжо расійска-англійскія і англа-расійскія размоўнікі: каб маглі на базавым узроўні кантактаваць з гасцямі. Плануецца падключыць і валанцёраў з ліку студэнтаў Мінскага лінгвістычнага ўніверсітэта, існуе папярэдняя дамоўленасць. Валанцёры будуць дзяжурыць каля кантралёраў і змогуць дапамагчы ўдзельнікам і заўзятарам чэмпіянату зарыентавацца ў незнаёмым горадзе.

ПЛАНЕТА ЛЮДЗЕЙ

Муратбек чытае “Новую зямлю”

Выкладчык і журналіст з Астаны плануе стварыць Казахстанска-беларускае таварыства дружбы і абараніць дысертацыю ў Мінску

Алесь Мурочак

Госцю з Казахстана ў Музеі Якуба Коласа паказвалі новую “фішку”: прапанавалі запісаць ягоны голас, прачытаць урывак з паэмы “Новая зямля” ў перакладзе на казахскую мову. Мой калега, бачна было, хваляваўся, ды потым гартанны голас яго загучаў больш упэўнена. Правай рукой трымаў зборнік, а левай быццам стрымліваў за вуздэчку гарачага скакуна. Падалося: радкі пра мілы сэрцу родны кут захапілі, паднялі над рэальнасцю і яго, ураджэнца стэпавага і цаліннага краю. Помніцца, калі быў я ў прэс-туры ў Астане, Паўночным Казахстане, знакамітым курортным месцы Бурабай, то не раз даводзілася чуць: казахі, як і беларусы, адчуваюць крэўную повязь з роднай зямлёй. Мяркую запытаць у наступны раз у свайго казахстанскага сябра: а які ён, родны кут Муратбека?

Знаёмства з дацэнтам Еўразійскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Льва Гумілёва, журналістам Муратбекам Тактагазіным пачалося ў нас завочна: пра цікавасць нашай газеты да тэмаў беларуска-казахстанскага супрацоўніцтва яму расказала Карлыгаш Баргекава. А яна ўзначальвае Казахстанска-Беларускі цэнтр навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва ў тым жа ўніверсітэце Астаны. Збіраючыся ў камандзіроўку ў Інстытут журналістыкі Беларускага дзяржуніверсітэта, калега напісаў мне, што яму цікава больш даведацца пра перапіску Якуба Коласа і казахстанскага класіка Каліжана Бекхожына.

Нас гасцінна сустрэла дырэктар Коласаўскага музея Зінаіда Камароўская. Найперш яны з Муратбекам абмяняліся сувенірамі, потым ён з цікавасцю разглядваў аўтограф

ІВАН ЖДАНОВІЧ

Зінаіда Камароўская і Муратбек Тактагазін

Бекхожына на зборніку Коласавых вершаў, выдадзеным у Казахстане і дасланым у музей у 50-я гады. Муратбек паабяцаў пацікавіцца ў сына казахскага паэта: можа, у архівах бацькі ёсць нейкія згадкі пра Беларусь? Ці нават і аўтографы Якуба Коласа…

Госцю паказалі музей, расказалі шмат пра Якуба Коласа, яго творчасць, сядзібу. З вялікай цікавасцю далучаўся журналіст з Астаны да новага, незнаёмага яму свету. Асабліва ж уразіла яго карціна “палескай Венецыі” — пейзаж з будынкамі на вадзе, месцы “палескай глушы”, дзе настаўнічаў Кастусь Міцкевіч.

У планах Муратбека — наладжванне культурных стасункаў паміж народамі, у тым ліку і праз калег-журналістаў. Дарэчы, ён піша цяпер кандыдацкую і збраецца абараняць яе ў Мінску, у Інстытуце журналістыкі. Даследаванне старшыні савета рэдактараў нацыянальнага штотыднёвіка “Эдилет БАК медиа” і віцэ-прэзідэнта Клуба галоўных рэдактараў Казахстана, упэўнены, будзе цікавым і ў Беларусі.

Сустрэча праходзіла ў дзелавым тэмпе, бо Муратбека чакалі і ў Цэнтры казахскай мовы, гісторыі і культуры імя Абая, аднак была ўзаемакарыснай. Музей зацікаўлены ў тым, каб больш даведацца пра сувязі Якуба Коласа з пісьменнікамі Казахстана. А Муратбек плануе стварыць Казахстанска-беларускае таварыства дружбы, каб па яго каналах умацоўваць культурныя, дзелавыя сувязі паміж братнімі народамі.

…Муратбек быў узрушаны, калі пры развітанні ў музеі яму падарылі на памяць кампакт- дыск з паштоўкай і ягоным запісам урыўка з Коласавай паэмы. Супрацоўнікі музея казалі: раней ніхто вершаў па-казахску ў іх не чытаў. Казах пакінуў і тэкст у Кнізе ганаровых гасцей. Яму паабяцалі: па цёплым часе госця звозяць у Панямонне, на Стаўпеччыну. Папрасілі толькі прывезці “Коласу ў падарунак” маленькае дрэўца ў Парк дружбы народаў, які там цяпер ствараецца. Так што — чакаем у госці, Муратбек!

КЛАСІК

І праўнучкай вярнулася Алеся

Творы Аркадзя Куляшова перакладаліся на многія мовы свету

Рыгор Арэшка

Ягонымі радкамі пра развітанне з дзяўчынай Алесяй — той верш лёгка знайсці ў інтэрнэце па першым слове “бывай” — немагчыма не захапляцца. Пазней ён гожа лёг на музыку Ігара Лучанка ды па-новаму загучаў у выкананні знакамітых мулявінскіх “Песняроў”. Згадаем радкі, якія Аркадзь Куляшоў напісаў у 14 гадоў: “Бывай, абуджаная сэрцам, дарагая./ Чаму так горка, не магу я зразумець./ Шкада заранкі мне, што ў небе дагарае/ На ўсходзе дня майго, якому ружавець…” Аж сэрца замірае ў прыпеве, калі ў шчымлівым развітанні з першым каханнем гучаць словы: “Стаю на ростанях былых, а з паднябесся/ Самотным жаўранкам звініць і плача май”.

Дарэчы, у адным з каментараў да верша ў інтэрнэце чытаем: “Якой пяшчотай павявае ад гэтага верша! Якая прыгожая беларуская мова гучыць у ім! Цудоўны паэт… Я сама ўкраінка, але з беларускімі каранямі, таму ўсё, што звязана з гэтай культурай, мне цікава.”

Між тым сэрца паэта, які нарадзіўся сто гадоў таму ў засыпаным цяпер Чарнобыльскім попелам мястэчку Саматэвічы, умяшчала ў сабе і вобраз Алесі, і плынь ціхай рэчкі Беседзі, што цякла побач з паселішчам, і акіянскія прасторы... Хоць адна з паэмаў мае назву “Далёка да акіяна”, але ж пісаў ён і пра яго. Увогуле ж, як гаварылася на юбілейнай музычна-паэтычнай вечарыне “Аркадзь Куляшоў. Ад Бесядзі да акіяна”, асоба паэта займае выключнае месца ў культурнай прасторы Бацькаўшчыны. Ён пакінуў нам творы глыбокага маральна-этычнага, гуманістычнага, эстэтычнага зместу, узбагаціў літаратуру паэзіяй душы. Дарэчы, Пімен Панчанка называў паэзію Куляшова “духоўнай энцыклапедыяй яго пакалення”. Вялікая колькасць вершаў Аркадзя Куляшова пакладзена на музыку.

Імпрэза ладзілася ў дзень нараджэння народнага паэта ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі з удзелам Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. На ёй гаварылі таксама, што паэт плённа працаваў і як кінасцэнарыст. Адкрылася і кніжная выстава “…І сэрца абпалена смагай радка”. Увогуле юбіляр — аўтар каля 30 кніг паэзіі, творы яго перакладзены на розныя мовы. На выставе прадстаўлены вершы на рускай, украінскай, польскай, англійскай, літоўскай, балгарскай мовах, а таксама на таджыкскай, армянскай, мангольскай ды іншых.

У вечарыне ўдзельнічалі родныя і сябры Аркадзя Куляшова, даследчыкі і пісьменнікі. Гасцей парадаваў выступленнем фальклорны гурт “Ліцвіны” пад кіраўніцтвам Уладзіміра Бярберава — унука Аркадзя Куляшова. Прэзентаваліся малюнкі юнай мастачкі Алесі Іса — гэта праўнучка юбіляра. Як бачым, эстафета творчасці ў нашчадках паэта прадаўжаецца.

ПРАЕКТЫ

Ізноў пачалася “Эпоха”

З пачатку лютага на тэлеэкраны Беларусі вярнуўся ўнікальны гістарычны серыял Алега Лукашэвіча

Віктар Корбут

Сюжэты пра знакамітых беларусаў у мінулыя гады выходзілі, як вядома, на тэлеканале “Беларусь 1” — цяпер жа іх можна глядзець на “Беларусь 3”. Першая серыя прысвячалася Адаму Міцкевічу.

Рэдактар тэлеканала “Беларусь 3” Кацярына Керэмша нагадала, што праграма здымалася не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой. А жылі і працавалі вядомыя землякі ў Чылі, Францыі, Ізраілі, Польшчы, Вялікабрытаніі, Румыніі, Літве, ЗША, Японіі, Егіпце. Асаблівасць жа цяперашняга серыяла “Эпоха” такая. Раней праграмы цыкла выходзілі нерэгулярна, па меры стварэння, у іх быў розны хранаметраж. Цяпер фільмы ўпарадкаваныя і будуць з’яўляцца ў эфіры кожны тыдзень. Прычым кожны аповед — па 52 хвіліны.

Выйдуць у эфір гісторыі з жыцця прэзідэнта сената Гаваяў Мікалая Судзілоўскага-Руселя, паэта Максіма Багдановіча, аднаго з заснавальнікаў кінакампаніі Metro-Goldwyn-Mayer і прэміі “Оскар” Луіса Майерса, мастакоў Івана Хруцкага, Марка Шагала, Напалеона Орды, навукоўца Ігната Дамейкі, прападобнай Еўфрасінні Полацкай ды іншых вядомых як у Беларусі, так і далёка за межамі краіны асоб.

Кожную серыю можна будзе паглядзець двойчы: позна ўвечары па суботах ці днём у нядзелю. Дакладны час — па праграме. Для тых, хто жадае

Адзін з мінулых фільмаў Алега Лукашэвіча з серыяла “Эпоха”

пабачыць унікальныя серыі праекта, не маючы ўпэўненага прыёму Трэцяга беларускага тэлеканала, варта скарыстацца інтэрнэтам. Глядзець праект таленавітага ўраджэнца Ляхавіч, лаўрэата прэміі “За духоўнае адраджэнне” Алега Лукашэвіча анлайн можна на сайце http://3belarus.by/ Пра тых, хто знамянаваў сабой яркія этапы ў гісторыі, варта ведаць.

Заснавальнік: Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск

Рэдактар Віктар Міхайлавіч Харкоў

Адрас рэдакцыі: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61. Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290 60 11

Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31

E–mail: golas_radzimy@tut.by

Аб’ём выдання: 1 друк. арк.

Тыраж: 1930, **Заказ:** 137

Час падпісання ў друк: 20.10 Выходзіць 1 раз на тыдзень

Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 3.04.2009. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.

© “Голас Радзімы”, 2014